

# ЛЕКЦИОННЫЕ ЗАНЯТИЯ: теория и методика



Учреждение образования
«Брестский государственный университет имени А.С. Пушкина»

# ЛЕКЦИОННЫЕ ЗАНЯТИЯ: ТЕОРИЯ И МЕТОДИКА

Брест
БрГУ имени А.С. Пушкина
2008

УДК 378.147.31(072)
ББК 74.58я73
Л-43

*Рекомендовано редакционно-издательским советом учреждения образования «Брестский государственный университет имени А.С. Пушкина»*

*Авторы:*

**С.Г. Рачевский** (руководитель авторского коллектива),
**А.Н. Вабищевич, М.С. Ковалевич, И.Н. Климашевская, Л.Г. Лысюк, Е.И. Медведская, Н.Н. Павлик, Г.В. Писарук, С.С. Секержицкий, М.А. Сыч, А.Н. Тарасюк**

Под общей редакцией кандидата филологических наук **С.Г. Рачевского**

*Рецензенты:*

кандидат социологических наук, доцент
**Е.Н. Григорович**

кандидат филологических наук, доцент
**Г.М. Концевая**

Л-43 **Лекционные** занятия: методика и практика : пособие / С. Г. Рачевский [и др.] ; под общ. ред. С. Г. Рачевского. – Брест : БрГУ, 2008. – 134 с.
ISBN 978-985-473-387-6.

В пособии раскрываются особенности лекции как вида учебных занятий в высшей школе, современные требования к ее проведению, основные моменты методики. Пособие содержит также конспекты лекций, прочитанных преподавателями – участниками конкурса «Мастер лекционных занятий», проведенного в Брестском государственном университете имени А.С. Пушкина в 2007 году.

Книга адресована всем, кто желает совершенствовать лекционное мастерство и тем самым повысить свой профессиональный уровень.

**УДК 378.147.31(072)**
**ББК 74.58я73**

**ISBN 978-985-473-387-6**

© УО «Брестский государственный университет имени А.С. Пушкина», 2008

4. Лекция – ведущая форма учебного процесса / А. С. Зубра // Педагогическая культура преподавателей высшей школы : пособие / А. С. Зубра. – Минск, 2005. – С. 327–350.

5. Педагогические основы самостоятельной работы студентов : пособие для преподавателей и студентов / под общ. ред. О. Л. Жук. – Минск : РИВШ, 2005. – 112 с.

6. Пидкасистый, П. И. Искусство преподавания: первая книга учителя / П. И. Пидкасистый, М. Л. Портнов. – 2-е изд. – М. : Педагогическое общество России, 1999. – 212 с.

7. Подласый, И. П. Педагогика : в 3 кн. / И. П. Подласый. – М. : Владос. – Кн. 2 : Теория и технологии обучения. – 575 с.

8. Серова, И. И. Лектор в студенческой аудитории: проблемы общения / И. И. Серова. – Минск : Университетское, 1988. – 70 с.

**А.М. ВАБІШЧЭВІЧ,**
загадчык кафедры гісторыі славянскіх народаў,
кандыдат гістарычных навук, дацэнт

## КУЛЬТУРА БЕЛАРУСІ Ў ПАЧАТКУ XX СТАГОДДЗЯ

**Адзначым галоўныя тэндэнцыі развіцця беларускай культуры ў пачатку XX ст.:**

1. Наяўнасць у беларускай нацыянальнай культуры двух напрамкаў развіцця – буржуазна-ліберальнага і рэвалюцыйна-дэмакратычнага.

2. Фарміраванне новай беларускай літаратуры, літаратурнай мовы.

3. Развіццё вуснапаэтычнай творчасці і беларускага народнага музычнага мастацтва.

4. Культурнае жыццё беларускага народа ва ўмовах узаемаўплыву нацыянальных культур.

5. Уплыў рэвалюцыйнага, нацыянальна-вызваленчага руху на развіццё культуры.

**Назавём фактары, якія ўскладнялі развіццё беларускай культуры ў пачатку XX ст.:**

1. Абгрунтаванне дзяржаўнай асімілятарскай палітыкі царызму праз ідэалогію «заходнерусізму». Царскі ўлад не прызнаваў існавання беларускай нацыі. Пры гэтым праводзіцца работа з тэрмінам «заходнерусізм».

2. Адсутнасць ВНУ.

3. Замаруджаны і супярэчлівы працэс фарміравання беларускай нацыі.

4. Нізкі ўзровень нацыянальнай самасвядомасці беларускага народа.

5. Канфесійная раз’яднанасць беларусаў на праваслаўных і католікаў, якая перашкаджала паўнацэннаму этнакультурнаму развіццю. Царскія ўлады, агульнарасійскія, польскія партыі, каталіцкі касцёл і праваслаўная царква атаясамлівалі канфесійную прыналежнасць з этнічнай, што таксама не садзейнічала этнічнай кансалідацыі.

6. Русіфікатарская палітыка царскіх улад.

7. Паланізатарская дзейнасць польскіх памешчыкаў, рымска-каталіцкай царквы.

8. Рэжым выключных законаў.

9. Рэпрэсіі царскіх улад ў дачыненні да перадавых грамадскіх і культурных дзеячаў.

Буйным цэнтрам беларускага грамадска-культурнага жыцця ў пачатку XX ст. з’яўляўся Пецярбург. Менавіта там па ініцыятыве прафесара Пецярбургскага універсітэта Б. Эпімах-Шыпілы ў маі 1906 г. была заснавана суполка «Загляне сонца і ў наша ваконца», якая займалася сістэматычным, планамерным выданнем беларускіх кніг. Першай кнігай стаў «Беларускі лемантар, або Першая навука чытання» А. Пашкевіч (Цёткі). Беларускія кнігі выдаваліся кірыліцай і лацінкай. Публікацыя «Дудкі беларускай», «Смычка беларускага» Ф. Багушэвіча выклікала адмоўную рэакцыю царскіх улад. У Варшаве, Вільні, Мінску, Віцебску, Гродне, Гомелі былі адкрыты контрагенцтвы выдавецтва «Загляне сонца і ў наша ваконца», праз якія распаўсюджвалася літаратура. Значную частку свайго заробку Б. Эпімах-Шыпіла аддаваў на ўтрыманне суполкі. Грошы на выданні паступалі і ад ахвярадаўцаў (сярод іх – М. Радзівіл). Сярод пашыраных тады форм папулярызацыі гісторыка-культурнай спадчыны былі мастацкія імпрэзы, вечарыны з дэкламацыяй вершаў, тэатральнымі пастаноўкамі, харавымі спевамі. Усяго выдавецтвам «Загляне сонца і ў наша ваконца» было надрукавана больш за 100 тыс. экземпляраў кніг. У пачатку Першай сусветнай вайны суполка спыніла сваю дзейнасць. Акрамя гэтага выдавецтва у пачатку XX ст. дзейнічала некалькі іншых прыватных выдавецтваў: «Наша ніва», «Наша хата», «А. Грыневіч», «Беларус», «Менчук», «Палачанін».

Адной з першых беларускамоўных газет была «Наша доля», якая друкавалася кірыліцай і лацінкай. Рэдактарам-выдаўцом першых чатырох нумароў быў І. Тукеркес, з пятага – А. Гедвіла. Усяго выйшла шэсць нумароў газеты «Наша доля» (апошні – 14 снежня 1906 г.). Галоўную ролю ў рэдагаванні газеты сыгралі браты І. і А. Луцкевічы, А. Пашкевіч (Цётка), К. Каганец. Закрыццё «Нашай долі» (афіцыйна забаронена 11 студзеня 1907 г.) было абумоўлена як рэпрэсіямі з боку царскіх улад, фінансавымі цяжкасцямі, так і расколам унутры рэдакцыі.

10(23) лістапада 1906 г. частка супрацоўнікаў «Нашай долі» (браты І. і А. Луцкевічы, А. Пашкевіч (Цётка)) выдала першы нумар газеты «Наша ніва». Рэдактарам-выдаўцом спачатку быў З. Вольскі, а з 8 снежня 1906 г. – А. Уласаў. У маі–чэрвені 1907 г. літаратурны аддзел «Нашай нівы» ўзначальваў Я. Колас. У 1908 г. у рэдакцыю прыйшлі Ядвігін Ш., Я. Купала, у 1909 г. – С. Палуян, З. Жылуновіч (Цішка Гартны). Пазней да іх далучыліся З. Бядуля, М. Гарэцкі. Сакратаром рэдакцыі з'яўляўся В. Ластоўскі. З 1907 г. з газетай супрацоўнічаў М. Багдановіч, які ў 1911 г. па запрашэнні рэдакцыі прыязджаў у Беларусь. У 1914–1915 гг. рэдактарам-выдаўцом быў Я. Купала. Улічваючы канфесійны падзел беларусаў на праваслаўных і католікаў, «Наша ніва» друкавалася па-беларуску на кірыліцы і лацініцы, а з 1913 г. – толькі на кірыліцы.

Для выдання газеты былі і сацыяльна-псіхалагічныя перашкоды. З канца XVII ст. беларуская мова не была мовай адукацыі, навукі, грамадскага жыцця, дзяржаўных устаноў, цэркваў і касцёлаў. Усё гэта ўскладняла працэс фарміравання новай беларускай літаратурнай мовы.

А зараз пазнаёмімся з дакументамі (урыўкамі з нумароў газеты «Наша ніва» (1906–1907 гг.)):

*«Наша ніва» будзе другой беларускай газетай. Першая газета «Наша Доля» не жывець: яна была надта нядоўга, блiснула як маланка і згінула дзесьці. Разумеем мы, як важна цяпер беларуская газета, разумеем, якую вялікую работу яна можа зрабіць. І дзеля таго мы будзем старацца, каб наша газетка заглянула ўсюды, каб папала яна і пад страху беднай курной хаты мужыка-беларуса. Ні думайце, што мы хочам служыць толькі ці панам, ці адным мужыкам. Не, ніколі не! Мы будзем служыць усяму беларускаму скрыўджанаму народу, пастараемся быць люстром жыцця, каб ад нас, як ад люстра, свет падаў у цёмнасць... Мы будзем браць усё ад усіх і, зложыўшы ў парадак, зноў аддаваць. Ведайце добра, што «Наша Ніва» газета не рэдакцыі, а ўсіх беларусаў і ўсіх тых, хто ім спагадае. Кожны мае права быць выслуханым на старонках нашай газеты і кіраваць ёю, толькі каб было разумна. Мы з сваёй стараны будзем старацца, каб усе беларусы, што не ведаюць, хто яны ёсць, зразумелі, што яны беларусы і людзі, каб пазналі свае права і памаглі нам у нашай рабоце (Наша Ніва. 1906. № 1).*

**Праграмныя палажэнні газеты «Наша ніва»**

**І. Эканоміка:**

1. Утварэнне абласнога зямельнага фонду.
2. Скасаванне цераспалосіцы, сервітутаў.
3. Адмена ўскосных падаткаў.
4. Утварэнне хутарской гаспадаркі.
5. Выдача таннага крэдыту з боку дзяржавы.
6. Стварэнне складоў сельскагаспадарчай тэхнікі і сартавога насення.

7. Арганізацыя агранамічнай і заатэхнічнай дапамогі сялянам.
8. Развіццё хатніх промыслаў і рамяства.

**II. Палітыка:**

1. Нацыянальная аўтаномія.
2. Увядзенне ўсеагульнага, роўнага, тайнага і простага галасавання.
3. Абранне краявога сойма.
4. Пашырэнне мясцовага самакіравання.
5. Замена валасных судоў выбарнымі міравымі судамі.

**III. Культура:**

1. Заснаванне нацыянальнай школы.
2. Усеагульная бясплатная адукацыя.
3. Абуджэнне нацыянальнай свядомасці.
4. Барацьба супраць асіміляцыі.
5. Інтэрнацыяналізм *(Наша ніва. 1906. Снежань).*

*Разоў колькі яе канфіскавалі, не дапускалі ў вёскі. Не будзем шмат гаварыць аб гэтым. Прыпомнім толькі тыя цэлі і задання, спаўнення каторых даводзілася і дабіваецца «Наша Ніва», тады будзе ясна, чаму не ўсе яе ўлюбілі.*

*«Наша Ніва» – газета для беларускай беднаты працавітай; для тых 8 мільёнаў мужыкоў-беларусаў, чыю мову так доўга гналі і высмейвалі, для тых мужыкоў, каторыя цягнулі самае цяжкае ярмо паншчыны, каторых у канец збілі з толку ўсякія лекары, знахары і дабрадзеі народныя…*

*«Наша Ніва» ідзе на помач цёмнаму беларусу, хоча паказаць яму, што і ён не горшы за другіх людзей; хоча закінуць у яго загнаную душу зерне праўды і свету, жаданне лепшага жыцця дый выклікаць да работы яго дрэмлючы розум, каб смела агледзеўся вакруг, каб спытаўся: «Хто ж ворагі нашы?» І каб дазнаўся, што найгоршы наш вораг – цемната векавая. А ў гэтай цемнаце ўсё карэнні пакуты і неўстройства жыцця.*

*Каб споўніць гэтае заданне, трэба знаць душу беларуса, яго радасці і гора, яго звычаі і мову, і трэба іх «уважыць». І «Наша Ніва» гаворыць да яго ў роднай яго мове, каб ён сам разумеў усё, каб ведаў, што яго мова, як і ўсякая другая, ёсць мова чалавека, на каторую ён мае святое права. Толькі такім спосабам можна давесці да таго, каб мужык-беларус пачуў у сабе чалавека, роўнага ўсім.*

*Гэтым ніхто не забараняе беларусу знаць мову суседніх нацый – расейскую і польскую, ад каторых яму ёсць чаго навучыцца: расейскі і польскі народ маюць вялікую навуку – вялікую культуру. Не карыстаючыся з іх, беларус не зможа развівацца, не зможа дайсці свету навукі; вось чаму варта і трэба пазнаваць тыя мовы. Ад шчырага сэрца мы радзім: «Свайго не цурайся – чужому навучайся!» Абы гэта было добра і разумна (Наша Ніва. 1907. № 33).*

На старонках газеты «Наша ніва» сцвярджалася, што гістарычнае прызванне кожнага народа заключаецца ў развіцці сваёй нацыянальнай культуры. Абвяргаўся тэзіс аб тым, што гістарычны працэс непасрэдна

вядзе да зліцця меншых народаў з большымі. На старонках «Нашай нівы» актыўна папулярызавалася гісторыя і культура Беларусі. З 1910 г. там друкавалася «Кароткая гісторыя Беларусі» В. Ластоўскага. У дзейнасці газеты «Наша ніва» арганічна спалучалася нацыянальнае і інтэрнацыянальнае. Уступаючы ў палеміку з рускімі шавіністычнымі выданнямі (сярод іх былі газеты «Виленский вестник», «Минское слово», «Окраины России», часопіс «Крестьянин» і іншыя), польскім нацыяналістычным друкам, яна ніколі не атаясамлівала іх з рускімі і польскімі народамі, культурамі, мовамі. Газета рашуча выступала супраць яўрэйскіх пагромаў. Адстойваючы ўласныя этнакультурныя інтарэсы, «Наша ніва» выступала супраць нацыянальнай нянавісці, выказвалася за паважлівае стаўленне да кожнага народа.

Газета закранала разнастайныя тэмы – ўнутраную і знешнюю палітыку царызму, культурнае жыццё, давала сельскагаспадарчыя парады і г.д. Па сваім характары «Наша ніва» была выданнем для сялян. У апошнія гады сваёй дзейнасці «Наша ніва» была ў росквіце сіл, у апагеі сваёй папулярнасці, пра што сведчаць шматлікія лісты ў газету. Надрукаваныя допісы былі ў асноўным з вясковай мясцовасці, у іх апавядалася пра сялянскае жыццё. Рэдакцыя мела больш за 3 тысячы пастаянных і часовых карэспандэнтаў у павятовых і губернскіх гарадах, вёсках, мястэчках Беларусі, у Пецярбургу, Маскве, Сібіры і за межамі Расійскай імперыі. Царская адміністрацыя забараняла падпіску і чытанне «Нашай нівы» ўсім настаўнікам Віленскай навучальнай акругі, святарам, служачым пошты, войска, паліцыі, валасных органаў, вучням сельскагаспадарчых школ.

«Нашаніўскі» перыяд у гісторыі беларускай літаратуры быў даволі выніковым. Найбольш значнымі творамі былі верш Я. Купалы «Мужык«, паэтычныя зборнікі А. Пашкевіч (Цёткі) «Скрыпка беларуская», «Хрэст на свабоду» (1906 г.). Варта адзначыць таксама зборнікі Я. Купалы «Жалейка» (1908 г.), «Гусляр» (1910 г.), «Шляхам жыцця» (1913 г.), яго драматычныя і рамантычныя паэмы, п'есы «Паўлінка», «Раскіданае гняздо», зборнікі Я. Коласа «Песні жальбы» (1910 г.), «Апавяданні» (1912 г.), «Родныя з'явы» (1914 г.), зборнік М. Багдановіча «Вянок» (1913 г.). На першы план у творчасці беларускіх літаратараў выступілі праблемы «зямлі і волі», новага чалавека і гераічнай асобы, узаемаадносін чалавека і грамадства, ролі культуры ў жыцці народа. Галоўным героем становіцца селянін, яго духоўны рост, абуджэнне нацыянальнай годнасці. Газета «Наша ніва» і беларускі літаратурна-грамадскі рух прыцягвалі да сябе выдатных інтэлектуалаў, перспектыўных маладых пісьменнікаў.

Старонкі газеты «Наша ніва» адлюстроўвалі плённае засваенне здабыткаў іншых народаў. Публікаваліся па-беларуску творы рускіх (А. Пушкін, І. Крылоў, М. Някрасаў, М. Горкі, А. Чэхаў і інш.), польскіх

ці польскамоўных (А. Міцкевіч, У. Сыракомля, М. Канапніцкая і інш.), украінскіх (Т. Шаўчэнка, М. Крапіўніцкі і інш.) пісьменнікаў, паэтаў.

У беларускай гістарычнай навуцы доўгі час дзейнасць «Нашай нівы» вызначалася з пазіцыі афіцыйнай камуністычнай прапаганды. Пасля дыскусіі аб «Нашай ніве» на пасяджэнні Таварыства гісторыкаў-марксістаў у студзені 1931 г. за газетай замацаваўся ярлык «контррэвалюцыйнага», «ліберальна-буржуазнага», «нацыяналістычнага» выдання. Толькі ў 1960–80-я гг. у даследаваннях С. Александровіча, У. Конана, Р. Семашкевіча, М. Біча, А. Лойкі была адлюстравана сапраўдная роля і значэнне газеты ў гісторыі культуры Беларусі. Архіў «Нашай нівы» захоўваецца зараз у архівах, музеях, бібліятэках Беларусі, Літвы. Пакуль ён вывучаны недастаткова, асабліва эпісталярная спадчына. «Наша ніва» спыніла свой выхад 7(20) жніўня 1915 г. па аб'ектыўных абставінах – набліжаўся фронт.

**Значэнне газеты «Наша ніва» заключаецца ў наступным**:

1. Абуджэнне нацыянальнай свядомасці беларускага насельніцтва.
2. Фарміраванне беларускай інтэлігенцыі.
3. Фарміраванне беларускай літаратурнай мовы.
4. Актывізацыя беларускага нацыянальна-вызваленчага руху.
5. Барацьба з польскім нацыяналізмам, рускімі манархістамі, царскімі ўладамі.
6. Выданне беларускіх кніг і часопісаў.
7. Прапаганда розных жанраў беларускага мастацтва.
8. Уклад у стварэнне беларускага нацыянальнага музея.

**Асноўнымі тэндэнцыямі ў развіцці архітэктуры Беларусі пачатку XX ст. трэба лічыць:**

1. Хуткае развіццё губернскіх і буйных павятовых гарадоў.
2. Рост гарадоў, размешчаных на чыгунцы (Баранавічы, Жлобін, Маладзечна, Орша, Полацк і інш.).
3. Дэмакратычнае развіццё горадабудаўніцтва (ніверліроўка адрозненняў паміж цэнтральнай забудовай і рабочымі ўскраінамі, узвядзенне будынкаў масавага прызначэння – бальніц, багадзельняў, школ, рамесных вучылішчаў).
4. З'яўленне ў буйных гарадах транспарту (конка, трамвай).
5. З'яўленне помнікаў манументальнага мастацтва (у 1912 г. у гонар першай перамогі рускіх войск у Айчыннай вайне 1812 г. быў закладзены помнік у Кобрыне (архітэктар – С. Ома; у час Першай сусветнай вайны былі згублены фігуры арлоў, бакавыя дошкі; адноўлены ў 1951 г.); з'явіўся мемарыяльны помнік у Віцебску; узведзены мемарыяльныя помнікі каля вёсак Лясная, Салтанаўка).

6. Стылявы плюралізм (пашыраліся гістарычныя формы, адбывалася нераасэнсаванне псеўдастыляў, гістарычная рэтраспекцыя).

7. Узвядзенне большасці буйных грамадзянскіх збудаванняў (вакзалы, гімназіі, вучылішчы, бальніцы і інш.) па індывідуальных праектах.

8. Кансерватыўны характар вясковага драўлянага дойлідства.

9. Звужэнне культавага будаўніцтва. Яно прыкметна здавала свае ранейшыя пазіцыі. Аднак цэрквы і касцёлы выконвалі горадаўтваральныя функцыі. Звернем увагу на касцёл Сымона і Алены (Чырвоны касцёл) у Мінску, культавыя пабудовы ў Браславе, Паставах, Свіры, Ракаве, касцёл Ушэсця ў Дзярэчыне, касцёл у в. Дварэц Дзятлаўскага раёна, Антоніеўскі касцёл (в. Каменка Шчучынскага раёна), касцёл у в. Пеляса Астравецкага раёна, Андрэеўскі касцёл (в. Нарач Мядзельскага раёна), капліцу Святаполк-Мірскіх у Міры, царкву А. Неўскага ў Мінску і інш.

**Царква А. Неўскага ў Мінску,** якая знаходзіцца на Вайсковых могілках, пабудавана ў 1896–1898 гг. з цэглы па праекце архітэктара В. Струева ў гонар перамогі рускіх войск у руска-турэцкай вайне 1877–1878 гг. Да 1910 г. належала ваеннаму ведамству. Помнік рэтраспектыўна-рускага стылю. Пры ўваходзе ў прытворы размешчаны мемарыяльныя дошкі з імёнамі 118 воінаў-беларусаў 30-й артылерыйскай брыгады і 119-га Каломенскага палка, якія гераічна загінулі пад Плеўнай (Балгарыя). У царкве захоўваюцца ваенныя рэліквіі (сцяг палка), за алтарнай сцяной былі пахаванні вышэйшых афіцэрскіх чыноў, дзве брацкія магілы воінаў.

**Свята-Мікалаеўская Брацкая царква ў Брэсце** была ўзведзена ў 1904–1906 гг. у руска-візантыйскім стылі з элементамі маскоўскага царкоўнага дойлідства XVII ст. на месцы мураванага кафедральнага сабора, у якім была прынята Брэсцкая царкоўная унія 1596 г. Будаўніцтва вялося на ахвяраванні маракоў і афіцэраў, удзельнікаў руска-японскай вайны, якія лічылі свяціцеля Мікалая сваім апекуном, і на сродкі брацтва ў гонар свяціцеля Мікалая і Афанасія Брэсцкага.

**Касцёл Святых Сымона і Алены (Чырвоны касцёл) у Мінску** ўзводзіўся ў 1906–1910 гг. на сродкі старшыні Мінскага таварыства сельскай гаспадаркі, слуцкага памешчыка Э. Вайніловіча, які ахвяраваў амаль усё сваё багацце на будаўніцтва касцёла ў гонар памерлых ад эпідэміі іспанкі (грыпу) дзяцей Алены і Сымона. Праект храма стварыў польскі архітэктар Т. Пайздэрскі (пры ўдзеле У. Марконі). Будаўніцтва ажыццяўляў архітэктар Г. Гай. Касцёл быў упрыгожаны на сродкі (1 500 руб.) графа Э. Чапскага, сям'і Скірмунтаў (старажытны абраз Маці Божай) і іншых прыватных асобаў. Паводле жадання фундатара касцёла 20 верасня 1910 г. архібіскуп Ключынскі асвяціў новы храм у імя святых Сымона і Алены, пры ўваходзе была ўстаноўлена мемарыяльная пліта з іх імёнамі. У 1909 г. на вежу былі ўзняты званы вагой 2 373 фунты. У адзіны

комплекс з касцёлам уваходзіла плябанія (мураваны 2-павярховы будынак) і частка мураванай агароджы з брамай.

З 1946 г. у будынку касцёла размяшчалася кінастудыя «Беларусьфільм», у 1975 г. ён быў прыстасаваны пад Дом кіно. У 1990 г. Чырвоны касцёл аднавіў сваю дзейнасць як культавая ўстанова.

Касцёл Святых Сымона і Алены ўяўляе сабой помнік архітэктуры неараманскага стылю (так званы «надрэйнскі рамантызм», які мае аналогіі з германскім раманскім саборам Бамбергу, апостальскай царквой у Кёльне). У архітэктуры выявіўся складаны інтэлектуальна-творчы пошук новай, яшчэ не раскрытай прыгажосці дойлідства сярэдневяковага раманскага перыяду. 3-нефавая базіліка набыла смелую, арыгінальную асіметрычную, складаную дынамічную аб'ёмна-прасторавую кампазіцыю са змешчанай па восі фасада 50-метровай вежай-званіцай і дзвюма меншымі сіметрычнымі вежамі па баках магутнай паўкруглай апсіды. Над галоўным парталам касцёла змешчаны герб Вайніловічаў. У інтэр'еры аконныя каляровыя вітражы, выкананыя па малюнках мастака з Піншчыны Ф. Бруздовіча. У 1970-я гг. зроблены новыя вітражы, якія ўвасаблялі алегорыі пяці мастацтваў, медныя люстры (мастак Г. Вашчанка). Мураваны алтар быў выкананы паводле праекта скульптара Ота. Каля касцёла ў 1996 г. пастаўлена скульптурная кампазіцыя «Архангел Міхаіл перамагае дракона» (скульптар І. Голубеў).

**Тэатр, музыка.** У 1899 г. у Мінску было створана таварыства аматараў мастацтваў. Яно аб'ядноўвала прадстаўнікоў мясцовай ліберальнай інтэлігенцыі. У складзе таварыства існавала 4 секцыі: літаратурная, драматычная, музычная, мастацкая. Паколькі дзейнасць аб'яднання набыла апазіцыйны да царскіх уладаў характар, то ў лютым 1906 г. яно было забаронена.

У пачатку XX ст. развіваліся асобныя музычныя школы, педагогі і навучэнцы выступалі на рабочых вечарынках, выконвалі рускую і замежную класіку, выдаваліся зборнікі беларускіх песень, вядомым стаў хор У. Тэраўскага. Кампазітары і музычныя дзеячы Л. Рагоўскі, А. Грыневіч, згаданы У. Тэраўскі займаліся апрацоўкай беларускіх песень.

У 1905–1907 гг. у некаторых гарадах, мястэчках існавалі аматарскія гурткі, якія сталі праводзіць «беларускія вечарынкі» з выступленнем хораў, танцораў, дэкламацыяй твораў беларускіх пісьменнікаў. Першая такая вечарынка адбылася вясной 1906 г. у в. Пятроўшчына пад Мінскам. Арганізатарамі выступалі А. Бурбіс, А. Уласаў і іншыя прадстаўнікі беларускай інтэлігенцыі. У развіцці беларускага тэатральнага і музычнага мастацтва важную ролю сыграў у 1910–1916 гг. Беларускі музычна-драматычны гурток у Вільні. Менавіта ім і была там арганізавана 12 лютага 1910 г. першая беларуская вечарына. У маі 1911 г. быў

зацверджаны статут гуртка (старшыня – Б. Даніловіч, намеснік – В. Ластоўскі).

Вечарынкі набылі вялікую папулярнасць. Мастацкія імпрэзы былі разлічаны не толькі на сялянства. Паводле аднаго з ідэолагаў польскіх «краёўцаў» М. Ромера, які прысутнічаў разам з жонкай на адным з такіх мерапрыемстваў у лютым 1911 г. у Вільні, на канцэрце ён сустрэў прадстаўнікоў беларускай, польскай, літоўскай і рускай інтэлігенцыі, найбольшае ўражанне на яго зрабілі акцёрскае майстэрства А. Бурбіса і хор Л. Рагоўскага. У 1910–1915 гг. праз вечарынкі прапагандавалася беларускае мастацтва ў многіх гарадах Беларусі, а таксама ў Пецярбургу, Маскве.

Пачынальнікам беларускага прафесійнага тэатра лічыцца Ігнат Цярэнцьевіч Буйніцкі, які ў 1907 г. арганізаваў у фальварку Палівачы Дзісенскага павета аматарскі тэатр. З 1910 г. гэты тэатр стаў прафесійным. І. Буйніцкі быў не толькі кіраўніком мастацкага калектыву, але і таленавітым акцёрам. У дзейнасці тэатра арганічна перапляталіся драматургія, вакальнае выкананне, танцы. Рэпертуар тэатра І. Буйніцкага складалі: «Па рэвізіі», «Пашыліся ў дурні» М. Крапіўніцкага, «У зімовы вечар» Э. Ажэшкі, «Сватанне» А. Чэхава, «Модны шляхцюк» К. Каганца і іншыя пастаноўкі. Ставіліся таксама творы Я. Лучыны, Я. Купалы, Я. Коласа, А. Пашкевіч (Цёткі), М. Багдановіча і іншых. 12, 22 лютага, 27 сакавіка 1910 г. адбыліся паспяховыя выступленні тэатра ў Вільні. У тым жа 1910 г. артысты выступалі ў Дзісне, Свянцянах, у 1911 г. – у Пецярбургу. Адбыліся гастролі па беларускіх гарадах і мястэчках (Капыль, Нясвіж, Клецк, Ляхавічы, Слуцк, Мінск, Вілейка, Смаргонь, Ашмяны). У 1912 г. зноў былі выступленні ў Пецярбургу, а 15 лютага 1913 г. – у Варшаве. Фінансавыя цяжкасці фактычна спынілі дзейнасць тэатра І. Буйніцкага напярэдадні Першай сусветнай вайны.

**Выяўленчае мастацтва.** Характэрнай адметнасцю выяўленчага мастацтва Беларусі пачатку XX ст. з'яўлялася адсутнасць мясцовых прафесійных мастацкіх школ. Адкрыліся першыя прыватныя школы малявання – у Мінску, Віцебску, Магілёве. Дзейнічалі асобныя таварыствы, наладжваліся выстаўкі. Выразным было імкненне да стварэння нацыянальнай мастацкай школы. Большасць жывапісцаў атрымлівала мастацкую адукацыю ў галоўных мастацкіх цэнтрах Расійскай імперыі – у Пецярбургу, Маскве, а таксама за мяжой.

Выяўленчае мастацтва характарызавалася шматграннасцю. У пейзажным жанры працавалі Ф. Рушчыц, В. Бялыніцкі-Біруля, С. Жукоўскі. Прызнаным майстрам лірычнага пейзажу стаў В. Бялыніцкі-Біруля, які вучыўся жывапісу ў Маскоўскім вучылішчы ў рускіх мастакоў К. Каровіна, В. Паленава, І. Пранішнікава, захапляўся творчасцю

І. Левітана. У 1908 г. В. Бялыніцкі-Біруля атрымаў званне акадэміка жывапісу. Толькі вясне мастак прысвяціў каля 200 палотнаў.

У бытавым жанры працавалі яўрэйскія мастакі Ю. Пэн (з яго прыватнай школы выйшлі М. Шагал, С. Юдовін і інш.), Я. Кругер, Л. Альпяровіч. Графіка папаўнялася працамі Я. Драздовіча, К. Каганца.

На мяжы XIX–XX стст. з Беларуссю была звязана творчасць рускага мастака І. Рэпіна. У маі 1892 г. ён прыехаў сюды, каб набыць куток для летняга адпачынку і творчай працы ўдалечыні ад гарадской мітусні. Выбар майстра выпаў на невялікі маёнтак Сафіеўка каля Віцебска, размешчаны на беразе Заходняй Дзвіны. У адным з лістоў да В. Сярова ён выказваў свае першыя ўражанні: «Край тёплый, народ разнообразный. Есть белорусы (господствующее племя), поляки, литва и евреи!.. Теперь так и тянет туда». Мастак вярнуў маёнтку старую назву Здраўнёва, правёў там добраўпарадкаванне, асабіста прымаў удзел у гаспадарчых справах. Гаспадарчыя заняткі былі адлюстраваны ім у шэрагу малюнкаў («Касцы ў полі», «Рыга-асець» і інш.). Мастака зачароўвалі краявіды Заходняй Дзвіны. Сярод партрэтаў беларускіх сялян І. Рэпіна найбольшую вядомасць атрымаў партрэт С. Шаўрова «Беларус» (1892 г.) (знаходзіцца ў Рускім музеі ў С.-Пецярбургу), які лічыцца лепшым сялянскім партрэтам у рускім мастацтве. У Здраўнёве І. Рэпін стварыў цэлы шэраг палотнаў, якія ўвайшлі ў скарбніцу рускага і сусветнага мастацтва: «Асенні букет» (1892 г.), «На Заходняй Дзвіне. Усход сонца» (1892 г.), «Дуэль» (1896 г.), «На сонцы» (1900 г.) і іншыя. Усе яны вызначаліся багаццем і разнастайнасцю колеру. Апошні раз І. Рэпін быў у Здраўнёве ў 1904 г. Потым там гаспадарылі родныя, сваякі. Зараз у аднаўленай сядзібе размяшчаецца музейная экспазіцыя.

Адной з каларытных фігур сусветнага выяўленчага мастацтва XX ст. быў М. Шагал, чыё юнацтва і маладосць былі звязаны з Віцебскам.

У Віцебску М. Шагал атрымаў першыя ўрокі малявання ў мастака Ю. Пэна. У час вучобы ў Пецярбургу і Парыжы М. Шагала прыцягваў родны Віцебск. Мастак шчыра прызнаваўся: «Парыж – ты мой другі Віцебск!» М. Шагал стварыў «Віцебскую серыю» (каля 60 прац), прысвечаную любімаму гораду. Яго творчасць фарміравалася пад уплывам фавізму і кубізму. У Віцебску ў 1918 г. М. Шагал адкрыў школу «новага рэвалюцыйнага ўзору», дзе па яго запрашэнні выкладалі мастакі-авангардысты К. Малевіч, Л. Лісіцкі, В. Ермалаева, М. Дабужынскі, Р. Фальк, С. Юдовін. У 1922 г. М. Шагал назаўсёды пакінуў радзіму. Аднак праз усё жыццё мастак пранёс любоў да Віцебска. «Як самотны вандроўнік – я… нёс усе гады твой подых на маіх карцінах», – пісаў мастак у 1944 г. у звароце «Да майго горада Віцебска». – І так з табой размаўляў і, як у сне, бачыў цябе… Я не жыў з табой, але не было маёй карціны, якая

не дыхала б тваім духам і адлюстраваннем. …Лепшае, што магу я пажадаць сабе, – каб ты мовіў, што я быў і застаўся верным табе назаўсёды…». Вяртанне імя М. Шагала ў грамадскую свядомасць Беларусі пачалося з канца 1980-х гг. У Віцебску ўжо традыцыйнымі сталі Шагалаўскія мастацкія пленэры, працуе музей М. Шагала.

У цэлым трэба адзначыць наступныя **асаблівасці мастацкай культуры Беларусі пачатку ХХ ст.:**

1. Беларуская мастацкая культура развівалася пад уплывам рускай культуры. У перыяд станаўлення беларускай культуры засвойваліся традыцыі і каштоўнасці рускай культурнай спадчыны, паколькі адчувальнай станавілася прысутнасць рускіх сярод насельніцтва (інтэлігенцыя, чыноўнікі, праваслаўныя святары, рабочыя).

2. Беларуская мастацкая культура ўзаемадзейнічала з культурамі польскага, украінскага, яўрэйскага народаў.

3. Мастацкая спадчына беларусаў развівалася ў двух напрамках – ліберальным і рэвалюцыйна-дэмакратычным. Дзеячы ліберальнага напрамку (В. Ластоўскі, І. Луцкевіч, А. Уласаў і інш.) надавалі большую ўвагу нацыянальнай самабытнасці беларусаў; прадстаўнікі рэвалюцыйна-дэмакратычнай плыні (Я. Купала, Я. Колас, А. Пашкевіч (Цётка) і інш.) выступалі за сувязь з рускай дэмакратычнай культурай.

А зараз пазнаёмімся з **вучэбным праектам «Беларусь і аб Беларусі ў пачатку ХХ ст.: погляд праз 100 гадоў»**, які трэба будзе па тэме выканаць.

**Мэта праекта:**

1. Азнаёміць з асноўнымі накірункамі развіцця матэрыяльнай і духоўнай культуры беларускіх зямель у пачатку ХХ ст.
2. Паглыбіць веды па айчыннай гісторыі, этнаграфіі, гісторыі культуры.
3. Развіваць навыкі самастойнай працы студэнтаў, іх крытычнае мысленне, уменне даследаваць навуковыя праблемы.
4. Стымуляваць інтарэс студэнтаў да краязнаўства.
5. Выхоўваць павагу да культурных здабыткаў свайго народа.
6. Прывіваць эстэтычнае стаўленне да помнікаў культуры.

**Час выканання праекта:** 2 тыдні.

**Удзельнікі праекта:** студэнты 3-га курса гістарычнага факультэта.

**Этапы падрыхтоўкі і абароны праекта:**

**1. <u>Праектная ініцыятыва.</u>**

Выбар, фармуляванне і абмеркаванне тэмы праекта, вызначэнне асноўных напрамкаў даследавання (асвета; навуковыя даследаванні; «Сцежкамі старога Брэста» – архітэктурны воблік горада ў пачатку ХХ ст.).

**2. Вызначэнне канчатковага выніку праекта.**

Усведамленне значнасці праблемы захавання гісторыка-культурнай спадчыны на сучасным этапе.

**3. Стварэнне груп і размеркаванне абавязкаў.**

Кіраўнік праекта, мовазнаўца, этнограф, краязнаўца, аналітыкі, сучаснік.

**4. Распрацоўка групавога навучальнага маршруту.**

Навошта? – Паглыбіць свае веды, усвядоміць важнасць тэмы.

Што адкрыем, пра што даведаемся? – Якім быў узровень адукацыі, навуковых даследаванняў, якія помнікі таго часу захаваліся ў Брэсце.

Каму раскажам? – Сваім аднакурснікам.

**5. Стварэнне банка ідэй:**

- азнаёміцца з літаратурай, у якой можна знайсці інфармацыю па тэме праекта;
- прааналізаваць існуючую ў пачатку ХХ ст. сістэму адукацыйных устаноў, вызначыць узровень адукаванасці насельніцтва;
- высветліць прычыны, якія перашкаджалі развіццю асветы на Беларусі ў пачатку ХХ ст.;
- даследаваць творчасць Я. Карскага, яго ўклад у развіццё славянскага мовазнаўства;
- прасачыць ход гістарычных даследаванняў, вызначыць значэнне прац В. Ластоўскага;
- выкарыстоўваючы звесткі з літаратуры, правесці вандроўкі па вуліцах гістарычнай забудовы Брэста пачатку ХХ ст.

**6. Размеркаванне заданняў.**

**7. Збор матэрыялу. Кансультаванне.**

**8. Калектыўнае абмеркаванне выкананай работы.**

Выбар формы абароны праекта (вусная справаздача з выкарыстаннем мультымедыйнай прэзентацыі).

**9. Абарона праекта.**

| **Удзельнікі** | **Абавязкі (задачы)** |
|---|---|
| Кіраўнік праекта | Ва ўступным слове абгрунтаваць прычыну выбару тэмы, прадставіць удзельнікаў праекта. |
| Мовазнаўца | Прааналізаваць галоўныя працы ў галіне мовазнаўства, вызначыць дасягненні Я. Карскага ў вывучэнні беларускай мовы. |
| Этнограф | Расказаць пра тое, як традыцыі і звычаі беларускага народа адлюстраваны ў працах пачатку ХХ ст. |

| Удзельнікі | Абавязкі (задачы) |
|---|---|
| Аналітык па гісторыі навукі | Прапанаваць кароткія тэзісы па гісторыі айчыннай навукі адзначанага перыяду. |
| Краязнаўца | Пазнаёміць прысутных з помнікамі грамадзянскай і культавай архітэктуры Брэста. |
| Аналітык па гісторыі адукацыі | Прапанаваць кароткія тэзісы па гісторыі адукацыі Беларусі пачатку XX ст. |
| Сучаснік | Паразважаць над тым, як змянілася духоўнае жыццё Беларусі за апошнія 100 гадоў. |
| Кіраўнік праекта | Выступіць з заключным словам. |

## СПІС ЛІТАРАТУРЫ


Вучэбныя дапаможнікі:

1. Парашкоў, С. А. Гісторыя культуры Беларусі : вучэб. дапам. для ВНУ / С. А. Парашкоў. – Мінск : Бел. навука, 2003. – 444 с.

2. Русецкі, А. У. Мастацкая культура Беларусі : тэорыя і гісторыя : вучэб. дапам. / У. А. Русецкі. – Віцебск : ВДУ імя П. М. Машэрава, 2002. – 325 с.

3. Гісторыя Беларусі : у 6 т. – Мінск : Экаперспектыва, 2005. – Т. 4. – 519 с.

4. Гісторыя Беларусі : у 2 ч. / пад рэд. Я. К. Новіка, Г. С. Марцуля. – Мінск, 1998. – Ч. 1. – 416 с.

5. Культура Беларусі: лепшыя старонкі [Электронны рэсурс] : анталогія: у 5 ч. – Мінск : Бел. дзярж. ін-т праблем культуры, 2003. – Электрон. апт. дыскі (CD-ROM). – Ч. 1 : Архітэктура. – 1 дыск ; Ч. 5 : Музеі. – 1 дыск.

Манаграфічная і даведачная літаратура:

1. Александровіч, С. Пуцявіны роднага слова : праблемы развіцця беларускай літаратуры і друку другой паловы XIX – пачатку XX ст. / С. Александровіч. – Мінск, 1971. – С. 198–233.

2. Аляксееў, А. А. Спадчына Беларусі : фотаальбом / А. А. Аляксееў, А. В. Лукашэвіч. – Мінск : Мінская фабрыка каляровага друку, 2004. – 319 с.

3. Апчинская, Н. В. Марк Шагал : графика / Н. В. Апчинская. – М. : Сов. художник, 1990. – 222 с.

4. Архітэктура Беларусі : энцыкл. даведнік. – Мінск : БелЭн, 1993. – 620 с.

5. Валахановіч, А. Першы нелегальны настаўніцкі з'езд / А. Валахановіч // Беларускі гістарычны часопіс. – 2006. – № 7. – С. 33–37.

6. Вяртання маўклівая споведзь : Постаці творцаў беларускай гісторыі ў кантэксце часу. – Мінск : Вышэйшая школа, 1994. – 318 с.

7. Гісторыя беларускага мастацтва : у 6 т. – Мінск : Навука і тэхніка, 1989. – Т. 3 : Канец XVIII – пачатак XX ст. – 448 с.

8. Гісторыя беларускага тэатра : у 3 т. – Мінск, 1983. – Т. 1. – С. 343–464.

9. Дробов, Л. Н. Живопись Белоруссии XIX – начала XX в. / Л. Н. Дробов. – Минск : Вышэйшая школа, 1974. – 336 с.

10. Забаўскі, М. Дзяржаўная дума на старонках газеты «Наша ніва» ў 1906–1915 гг. / М. Забаўскі // Беларускі гістарычны часопіс. – 2006. – № 11. – С. 19–24, 25–33.

11. Карскі, Я. Беларусы / Я. Карскі. – Мінск : Беларускі кнігазбор, 2001. – 640 с.

12. Кулагін, А. М. Каталіцкія храмы на Беларусі : энцыкл. даведнік / А. М. Кулагін. – Мінск : БелЭн, 2000. – 216 с.

13. Кулагін, А. М. Праваслаўныя храмы на Беларусі : энцыкл. даведнік / А. М. Кулагін. – Мінск : БелЭн, 2001. – 328 с.

14. Лыч, Л. М. Гісторыя культуры Беларусі пад уладай Расійскай імперыі (канец XVIII ст. – 1917 г.) / Л. М. Лыч. – Віцебск : ВДУ імя П. М. Машэрава, 2007. – 207 с.

15. Навойчык, П. Дзве плыні ў «нашаніўскім» руху : з гісторыі беларускага Адраджэння / П. Навойчык // Роднае слова. – 1993. – № 9, 10, 12.

16. Наша ніва : першая беларуская газэта з рысункамі. – Вып. 1. – 1906–1908 гг. – Факс. выд. – Мінск : Навука і тэхніка, 1994.

17. Наша ніва : першая беларуская газэта з рысункамі. – Вып. 4. – 1911 г. – Факс. выд. – Мінск : Тэхналогія, 2003. – 684 с.

18. Несцярчук, Л. М. Замкі, палацы, паркі Берасцейшчыны X–XX стагоддзяў (гісторыя, стан, перспектывы) / Л. М. Несцярчук. – Мінск : БЕЛТА, 2002. – 336 с.

19. Няфёд, У. І. Ігнат Буйніцкі – бацька беларускага тэатра / У. І. Няфёд. – Мінск : Навука і тэхніка, 1991. – 124 с.

20. Семашкевіч, Р. М. Беларускі літаратурна-грамадскі рух у Пецярбургу (канец XIX – пачатак XX ст.) / Р. М. Семашкевіч. – Мінск : Выд-ва БДУ, 1971. – 136 с.

21. Славутыя імёны Бацькаўшчыны : зб. – Вып. 1. – Мінск : БФК, 2000. – 384 с.

22. Страчаная спадчына / Т. В. Габрусь [і інш.]. – Мінск : Беларусь, 2003. – 351 с.

23. Унучак, А. «Наша ніва» і ідэйнае выхаванне беларускай інтэлігенцыі / А. Унучак // Беларускі гістарычны часопіс. – 2005. – № 4. – С. 16–21.

24. Цьвікевіч, А. «Западно-руссизм» : нарысы з гісторыі грамадскай мысьлі на Беларусі ў XIX і пачатку XX в. / А. Цьвікевіч. – Мінск, 1993. – С. 295–342.

25. Шыбека, З. В. Мінск : старонкі жыцця дарэвалюцыйнага горада / З. В. Шыбека, С. Ф. Шыбека. – Мінск, 1994. – С. 160–191, 205–213.

*Учебное издание*

**Рачевский** Станислав Григорьевич
**Вабищевич** Александр Николаевич
**Ковалевич** Мария Степановна и др.

# ЛЕКЦИОННЫЕ ЗАНЯТИЯ: ТЕОРИЯ И МЕТОДИКА

Пособие

Редактор *С.В. Мосейчук*

Подписано в печать 20.12.2008. Формат $60\times84^1/_{16}$. Бумага офсетная.
Гарнитура Таймс. Ризография. Усл. печ. л. 7,91. Уч.-изд. л. 9,25.
Тираж 150 экз. Заказ № 516.
Издатель и полиграфическое исполнение
учреждение образования
«Брестский государственный университет имени А.С. Пушкина».
ЛИ № 02330/277 от 30.04.2004.
224016, Брест, ул. Мицкевича, 28.